# ДЫСКУРСІЎНЫ ПАДЫХОД У ГІСТАРЫЯГРАФІІ І КУЛЬТУРАЛОГІІ: СРОДКІ, МЕТАДЫ, МАГЧЫМАСЦІ

*Л. У. Ляховіч,*
*дацэнт кафедры гісторыі Беларусі і музеязнаўства Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта культуры і мастацтваў, кандыдат гістарычных навук, дацэнт*

На працягу апошніх дзесяцігоддзяў у постсавецкай, у тым ліку айчыннай, гістарыяграфіі, а таксама ў культуралагічных даследаваннях набыў развіццё дыскурсіўны падыход. Яго вытокі, аднак, ляжалі значна глыбей, у другой палове XX ст. – у структуралізме, постструктуралізме, а таксама ва ўсім комплексе ідэй і канцэпцый, якія потым назавуць «сітуацыяй постмадэрну». Для гуманітарных ведаў прынцыповае значэнне набылі два «павароты» – лінгвістычны і антрапалагічны, якія, акрамя таго, увасобілі жыццядзейнасць і прадукцыйнасць міждысцыплінарнасці. Менавіта з лінгвістыкі ў гуманітарныя веды арганічна ўвайшлі структурны аналіз і семіятычны. Адпаведна культура атрымала новы ракурс разгляду – як семіятычная (знакавая) сістэма, якая можа быць расшыфравана. Аднак наколькі адэкватнай будзе гэтая расшыфроўка? Ці супадзе сучасная інтэрпрэтацыя тэкстаў культуры з тымі сэнсамі, якія ўкладваліся ў культурныя артэфакты падчас іх стварэння? Не выпадкова з другой паловы 80-х гг. XX ст. заявіў аб сабе «кагнітыўны паварот» і была акцэнтавана ўвага на свядомасці, мысленні і разуменні. Было справядліва адзначана, што «…усе навукі маюць справу з чыста чалавечымі ведамі аб свеце…мы не ведаем нічога, не прапушчанага праз чалавечую свядомасць і – ў асноўным – не аб’ектывізаванага ў вербальных формах, у тэкстах і дыскурсе» [2, с. 368]. Таму гісторыкі перасталі абмяжоўвацца рэканструкцыяй сацыяльных структур мінулых эпох і звяртаюць увагу на свядомасць людзей мінулага, якая ўвасабляецца ва ўсёй разнастайнасці артэфактаў культуры. Адсюль зразумелы яшчэ адзін «паварот» – антрапалагічны. У адпаведнасці з ім сэнсастваральным цэнтрам любога аспекту культуры з’яўляецца чалавек ва ўсёй бясконцасці сваіх праяў.

Адзначанае здаецца зразумелым і натуральным. Аднак згаданыя змены прывялі да радыкальнага перагляду і ў рэшце рэшт адмовы ад традыцыйнага картэзіянска-ньютанаўскага суб’ектна-аб’ектнага разумення навукі. Сапраўды, што такое аб’ектыўныя веды, калі той, хто іх стварае, – суб’ект, жывы чалавек, свядомасць якога сфарміравалася пад уплывам канкрэтных сацыякультурных

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

фактараў, а змест ведаў абумоўлены сістэмай адукацыі, асабістымі перавагамі, умовамі працы, нарэшце, станам здароўя ці асаблівасцямі характару? Адбыўся натуральны працэс рэлятывізацыі ведаў, навука стала трактавацца як пэўная дыскурсіўная практыка, а тэорыя – як культурны акт [1, с. 12]. Даследчык знаходзіцца не над прадметам даследавання, а ў ім, ён не толькі ўключаны ў вывучаемы дыскурс, ён інтэрпрэтуе яго «тут і зараз», раскрываючы сэнсы іншых дыскурсіўных практык для сучаснага яму грамадства. У гэтай справе надзвычай важна не дапусціць спрашчэння, мадэрнізацыі, стэрэатыпаў, што патрабуе вялікага масіву суправаджаючых ведаў. І гэта акрамя абавязковага «ўжывання ў тэкст», герменеўтычных практык і метадаў дыскурс-аналізу.

Існуе мноства, на думку айчынных спецыялістаў, больш за 50 [7, с. 29] дэфініцый дыскурсу. З пазіцыі гістарычнай навукі ўдалым патрэбна прызнаць вызначэнне айчынных даследчыкаў У. Н. Сідарцова і В. М. Шутавай: дыскурс ёсць моўная свядомасць эпохі. З моўнай дзейнасці ва ўсіх яе праявах гісторык можа вызначыць, як «малявалі» ў мове сваё жыццё людзі вывучаемай эпохі. Адпаведна быццё ёсць тэкст, а свет – гэта semiятычнае ўтварэнне, якое можа быць расшыфравана [8, с. 38–43].

Кваліфікаваным і вычарпальным можна лічыць і вызначэнне дыскурсу, дадзенае расійскай даследчыцай В. Я. Чарняўскай: «Пад дыскурсам патрэбна разумець тэкст(ы) у непарыўнай сувязі з сітуатыўным кантэкстам: у сукупнасці з сацыяльнымі, культурна-гістарычнымі, ідэалагічнымі, псіхалагічнымі і іншымі фактарамі, з сістэмай камунікатыўна-прагматычных і кагнітыўных мэтаўстановак аўтара, які ўзаемадзейнічае з адрасатам, што абумоўлівае асаблівую – тую ці іншую – упарадкаванасць моўных адзінак рознага ўзроўню пры ўвасабленні ў тэкст» [9, с. 77–78].

Улічваючы разуменне тэксту ў шырокім сэнсе як семіятычнай сістэмы, што можа быць расшыфравана і інтэрпрэтавана, можна сказаць і больш. Культура ёсць сукупнасць бясконцай разнастайнасці дыскурсаў з неабмежаванымі магчымасцямі іх вывучэння і тлумачэння. Адпаведна існуе шмат тыпалогій дыскурсаў: вусны і пісьмовы, індывідуальны і калектыўны, інстытуцыянальны і персанальны, наратыўны і дыдактычны… Па функцыянальным крытэрыі – педагагічны, палітычны, навуковы, этычны, юрыдычны, ваенны, рэлігійны, медыцынскі і г.д. [3, с. 280–289; 5, с. 13–14]. Дыскурс разглядаецца і як працэс, і як сістэма, і як вынік. У апошнім выпадку дыскурс, будучы вытворным ад сацыякультурнай рэальнасці, сам змяняе і фарміруе яе.

Мноства падыходаў да аналізу дыскурсу, створаных у кантэксце развіцця гуманітарных ведаў, самі па сабе могуць быць прадметам асобнага даследавання [4, с. 91–95]. Пры непасрэднай працы з тэкстам, у залежнасці ад вылучэння прыярытэтнага аспекту, можна вылучыць камунікатыўны, прагматычны, семіятычны, кагнітыўна-дыскурсіўны, дыскурсіўна-дыялагічны, інтэгратыўны, каўзальна-генетычны падыходы [5, с. 11–12]. З пункту гледжання аўтара, у прыватнасці, пры гістарыяграфічных даследаваннях, універсальным па прычыне сваёй комплекснасці з'яўляецца інтэгратыўны падыход, які ўлічвае ўсе кампаненты дыскурсу як складанага феномена [5, с. 12].

Гістарыяграфічныя даследаванні пераважна маюць справу з навуковым тэкстам. Аўтар згодны з вызначэннем навуковага тэксту, дадзеным расійскай даследчыцай С. У. Ракіцінай. Навуковы тэкст яна разглядае як вынік «кагнітыўна-дыскурсіўнай дзейнасці вучонага, які ўтрымлівае адносна завершаныя навуковыя веды, структураваныя ў адпаведнасці з распрацаванай аўтарам канцэпцыяй, якая аб'ектывуецца сінкрэтычнай сістэмай агульнамоўных і ідыястылістычных сродкаў» [6, с. 14]. Неабходна мець на ўвазе, што, як і любая навука, гісторыя і гістарыяграфія інтэртэкстуальныя. Гэта відавочна ўжо з таго, што гістарыяграфічны агляд і аналіз ужо даследаванага – неад'емная частка любой навуковай працы. Дадзеная акалічнасць дазваляе «знімаць» розныя сэнсавыя напластаванні, што дае добры вынік як у рэтраспектыўным, так і ў перспектыўным вывучэнні.

Патрэбна адзначыць фактычную неабмежаванасць сферы прымянення дыскурсіўнага падыходу ў гістарыяграфіі, пры гэтым кантэнт-аналіз выступае адным з асноўных інструментаў даследавання. Так, прадметам вывучэння могуць быць пэўны перыяд у развіцці гістарычнай навукі, асобная праблема ў канкрэтна вылучаны момант, сукупнасць прац пэўнай навуковай школы ці аднаго гісторыка. Можна рабіць «кропкавае» даследаванне адной работы, на мікраўзроўні, паслядоўны аналіз прац канкрэтнага даследчыка з мэтай прасочвання развіцця менавіта яго дыскурсу і ідыястылю, нават, наколькі магчыма падрабязна рэканструяваць умовы працы гісторыка ва ўсіх іх праявах. Апошняе, між тым, складае экстралінгвістычны ўзровень аналізу тэксту, так званы над- і ваколтэкставы аналіз. Гэта «дух часу» з яго ідэалагічнымі, сацыяльнымі, міжасабовымі фактарамі. Міжтэкставы ўзровень аналізу дазваляе выявіць кантэнт аднародных тэкстаў і прырашчэнне сэнсу. Узровень асобнага камунікатыўнага акта вылучае яго інтэнцыю. Існуюць макрасемантычны ўзровень,

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

узровень асобнага тэксту з вылучэннем слоў, словазлучэнняў, тэкставых сэнсаў і г.д. [9, с. 89]. Пры дыскурс-аналізе ўлічваецца не толькі тое, што і як было сказана, але і тое, чаму, у параўнанні з папярэднім этапам, ужо не было нададзена ўвагі, а таксама афармленне і падача тэксту. Сукупнасць адзначаных характарыстык ва ўсёй іх рознабаковасці стварае разнастайнасць моўных практык, па сутнасці невычарпальных для даследавання.


1. *Зверева, Г. И.* Реальность и исторический наратив : проблемы самоpефлексии новой интеллектуальной истории / Г. И. Зверева // Одиссей. Человек в истории. – М. : Кода, 1996. – С. 11–24.

2. *Калашников, М. В.* Историко-семантический анализ в историческом исследовании : от истории понятий к истории общественного сознания / М. В. Калашников // Историческая наука сегодня: теории, методы, перспективы / под ред. Л. П. Репиной. – М. : Изд-во ЛКИ, 2011. – С. 368–390.

3. *Карасик, В. И.* Языковой круг : личность, концепты, дискурс / В. И. Карасик. – М. : Гнозис, 2004. – 390 с.

4. *Макаров, М. Л.* Основы теории дискурса / М. Л. Макаров. – М. : Гнозис, 2003. – 280 с.

5. *Маркович, А. А.* Дискурс : определения, история возникновения, типология, подходы к изучению дискурса / А. А. Маркович // Методология исследований политического дискурса: актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов : сб. науч. тр. / Белорус. гос. ун-т. – М. : Издат. центр БГУ, 2008. – Вып. 5 : Дискурс в современном гуманитарном знании. – С. 5–17.

6. *Ракитина, С. В.* Когнитивно-дискурсивное пространство научного текста : автореф. … д-ра филол. наук: 10. 02. 01 / С. В. Ракитина. – Волгогр. гос. пед. ун-т. – Волгоград, 2007. – 44 с.

7. *Сидорцов, В. Н.* Научный дискурс историка : социальная обусловленность и методология исследования / В. Н. Сидорцов, А. А. Приборович. – Минск : Издат. центр БГУ, 2013. – 192 с.

8. *Сидорцов, В. Н.* Лингвистический поворот в историографии и дискурс-анализ / В. Н. Сидорцов, О. М. Шутова // Методология исследований политического дискурса : актуальные проблемы содержательного анализа общественно-политических текстов : сб. науч. тр. / Белорус. гос. ун-т. – М. : Издат. центр БГУ, 2008. – Вып. 5 : Дискурс в современном гуманитарном знании. – С. 37–48.

9. *Чернявская, В. Е.* Дискурс власти и власть дискурса. Проблемы речевого воздействия: учеб. пособие / В. Е. Чернявская. – М. : Флинта ; Наука, 2006. – 136 с.


РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ